# Беларусь – рачная і азерная

*Людзі як рэкі*. Яны заўсёды ў руху, пастаянна ў крутаверці, неадольна імкнуцца за небакрай. Як рэкі ў прасторы ніколі не вяртаюцца да вытокаў, так у часе і людзі. Гэта быццёвая заканамернасць.

*І паводзінамі мы падобныя*. Зімою хаваемся ад марозу, укутваемся. Але як толькі сонейка дольш затрымаецца на небе, пранясецца па-вясенняму гаманлівы ветрык-шугавейка — і зазвіняць, загудуць ручаі і рачулкі, узарвуцца, завіруюць рэчкі і рэкі, вырвуцца на волю з берагаў, паімчацца па лугах, паплавах... І ў людзей ад вясновага водару кругам ідзе галава, душа перапаўняецца вострымі пачуццямі. А летам дбайна працуюць і людзі, і рэкі.

*Падобныя мы і лёсам, арганічна ўзаемапавязаныя*. Рэкі і рэчкі падтрымліваюць жыццядзейны працэс на кантынентах, ураўнаважваюць водны рэжым на зямной паверхні. Яны зносяць лішак вады з адной тэрыторыі ў іншыя, нават да мора, адкуль яна пасля выпарэння разганяецца ве-трам па паднябессі і вяртаецца ўжо ў выглядзе атмасферных ападкаў.

Адначасова водныя артэрыі пашыраюць межы духоўнасці, павялічваюць яе аб'ём у навакольнай прасторы. Водная плынь убірае ў сябе касмічную духоўную энергію і пераносіць яе. А ў беларускім краі рачная вада надзвычай духоўна-энергетычная. Бо жыўленне нашых рэк і рэчак — атмасферныя ападкі. Яны ж акумулююць духоўную энергію яшчэ ў надземнай вышыні, а потым даносяць яе да зямной паверхні. Частка гэтай высакароднай духоўнасці (духоўнай энергіі) застаецца на палях, лугах, у лясах, балотах (спажываецца раслінамі, жывёламі), а частка трапляе ў ручаі, рэчкі. На шляху да мора водная плынь успрымае энергію Сонца, Месяца і іншых нябесных аб'ектаў. На аб'ем духоўнага напаўнення рачной вады ўплываюць лясы і балоты, на якія багатая наша Беларусь. Духоўная энергія, якую ўтрымліваюць яны, далучаецца да той духоўнай плыні, што цягнецца за несупыннай вадою. Усе гэтыя абставіны (жыўленне атмасфернымі ападкамі, непасрэднае ўспрыманне духоўнай энергіі з космасу, абмен духоўнасцю з навакольным асяроддзем) вызначаюць высокую ступень духоўнага насычэння воднай прасторы на Беларусі.

Людзям наканавана памнажаць высакародную духоўную энергію, напаўняць прастору стваральнап духоўнасцю. Яны атрымліваюць гэтую энергію з навакольнай прасторы і трансфармуюць яе. Паступае духоўная энергія да іх і ад рачной вады. Заўсёды прасвятляецца ў душы ад суседства з ёю. Нават калі проста знаходзімся на беразе, сочым за вірлівасцю імклівай плыні ці засяроджваем увагу на спакойным гойданні хваляў. Вельмі моцнае ўздзеянне вады пры непасрэдным судакрананні з ёю. Пасля купання мы робімся больш спакойнымі, далікатна ўважлівымі, рамантычнымі, духоўна далучаемся да навакольнай прасторы, вытанчана ўспрымаем яе хараство. Гартуемся і душой, і целам.

Аднак у мінулым стагоддзі адбылося непапраўнае для ўсяго чалавецтва. Ад людской дзейнасці (развіцце прамысловасці і транспарту, хімізацыя сельскай гаспадаркі) пастуова забруждваюцца рэчкі і рэкі. Рачная вада становіцца шкоднай для цела і душы. У нашай краіне ручаі і невялікія рэчкі пачалі каналізаваць, г.зн. спрамляць іх рэчышчы. Вынік гэтай справы — незайздросны. У прасторы паменшылася вільготнасць і ўзніклі вятры-сухавеі. Ды і духоўнасці паслабела. Раней рэчкі пятлялі, спакойна неслі воды і, адпаведна, напаўнялі наваколле высакароднай энергетыкай. Цяпер жа воды імклівa выносяцца за межы рэгіёна, а з імі і духоўная энергія, што насычае іх.

Дзейнасцю, найчасцей прагматычнаю, людзі не заўсёды станоўча ўплываюць на характар рэк і рэчак, ператвараюць іх у транспартныя каналы, прыстасоўваюць да сваіх патрэб. Рэкі ж, у сваю чаргу, уздзейнічаюць на нашу сутнасць, імкнуцца падтрымаць наш духоўны стан, прасвятляюць душы, робяць пачуццёвасць больш вытанчанай. І мы гэта выразна адчуваем.

Наш край вызначаецца адметнай рачной сістэмай, якая спрыяе падтрыманню

высакароднай духоўнасці ў прасторы. Рэкі і рэчкі цякуць з поўначы на поўдзень, з усходу на захад і наадварот. Адны з іх нясуць воды ў Балтыйскае мора, другія — у Чорнае. Супрацьлеглы бег рачной плыні садзейнічае ўзнікненню віхурнага руху духоўна-энергетычнай масы, што прыходзіць з космасу зямной паверхні і выпрацоўваецца тут. Яна застаецца ў беларускай прасторы, не спяшаецца пакінуць абшары, затрымліваецца ў лясах і гаях, кансалідуецца ў вадаёмах і балотах. Такая кругаверць духоўнай плыні ніколі не спыняецца на Беларусі. То з'яўляюцца духоўныя віхры, магутныя па сіле ўздзеяння, ахопліваюць вялікі рэгіён, то распадаюцца надробныя, уплыў якіх не менш плённы на людзей.

Паглядзім з паднябесся на родную зямлю ці паразважаем над яе картай (гл. каляровую ўкладку). На поўначы краіны цячэ Заходняя Дзвіна, нясе воды на захад, да Балтыйскага мора. На ўсходзе ад яе велічна гойдаецца ў берагах Дняпро: яго курс — на поўдзень, у Чорнае мора. Да яго (з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход, нібы па дыяганалі карты нашай краіны) спяшаецца Бярэзіна, а злева ад яго шыбуе Сож.

Шматводная Прыпяць з'яўляецца своеасаблівым духоўным стрыжнем Палесся. З захаду на ўсход ляжыць яе шлях, пакуль не спаткаецца з Дняпром. А ў цэнтральнай частцы Беларусі вірлівы Нёман і спакойная Вілія імчаць на захад, ціхая Свіслач кіруецца на ўсход, каб уліцца ў Бярэзіну. І гэтак па ўсёй Беларусі. Бягуць рэкі і рэчкі на захад і ўсход, на поўдзень і поўнач — да Заходняй Дзвіны і Прыпяці (супрацьлеглыя рэкі), да Бярэзіны і Нёмана (таксама), да Дняпра і Сожа, актывізуюць віхурны рух духоўнай энергіі ў беларускай прасторы, дапамагаюць прыродным духоўным плыням надолей застацца тут.

Высокі патэнцыял духоўнага субстрату ў беларускай прасторы паўплываў на фарміраванне светапогляду, характару і паводзінаў насельнікаў гэтага краю, паспрыяў ім выкрышталізаваць лёсавызначальныя якасці характару, зрабіцца жыхарамі, асобамі...

*Людзі як рэкі.* Увесь час у руху, дзейнічаюць, каб зрабіць планету духоўна багатай.

Беларусь — рачная краіна. Больш за 20 тысячаў рэчак і рэк ажыўляюць яе прастору, аплятаюць яе духоўнасцю, трывала нітуюць. Можна лічыць, што на кожныя 10 квадратных кіламетраў прыпадае рачулка ці рэчка, рака. Яна і з'яўляецца сімвалам родных мясцін для тых, хто нарадзіўся тут, у маленстве бегаў па яе берагах. (Невялікіх рэчак, працягласцю каля 10 кіламетраў, амаль больш за 19 тысяч.) Некаторыя рэкі становяцца сімвалам вялікага рэгіёна. Іх шлях ад вытоку да вусця ляжыць на тэрыторыі некалькіх раёнаў. Сярод іх:

*Пціч* — 421 км
*Шчара* — 325 км
*Свіслач* (басейн Дняпра) — 297 км
*Друць* - 295 км
*Ясельда* - 242 км
*Бярэзіна* (прыток Нёмана) — 226 км
*Проня* — 172 км
*Свіслач* (прыток Нёмана) — 137 км.

А якую з вялікіх рэк можна назваць сімвалам Беларусі-рачной? Такіх рэк — працягласцю больш за 500 кіламетраў — некалькі: Бярэзіна, Вілія, Дняпро, Заходняя Дзвіна, Нёман, Прыпяць, Сож. Паразважаем.

*Дняпро* — самая вялікая рака на Беларусі. Яго агулыіая даўжыня — 2.145 км, на нашу краіну прыпадае амаль трэць — 690 км. Працякае па тэрыторыі трох абласцей: Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай. На ім стаяць абласны цэнтр Магілёў і шэраг раённых — Дуброўна, Орша, Шклоў, Быхаў, Рагачоў, Жлобін, Рэчыца, Лоеў. Аднак гэтая рака болын слаўная ва Украіне (970 км прабягае там). І яе сталіца — Кіеў — знаходзіцца на Дняпры. Ды і выток бярэ ў Расіі.

*Прыпяць* — правы прыток Дняпра — збірае ваду З усяго Палесся і духоўна, эканамічна яднае не толькі гэты край. Яна з'яўляецца своеасаблівай сарцавінай магутнага духоўнага аазіса ўсёй Еўропы. Але пачынаецца рака на ўкраінскай тэрыторыі і на ёй упадае ў Дняпро, хоць дзве трэці (500 км) свайго шляху пралягае праз Беларусь.

Падобны лёс у Заходняй Дзвіны і ў Сожа. Вытокі — у Расіі. Паўночная прыгажуня Заходняя Дэвіна звязвае Віцебск і раённыя гарады Бешанковічы, Полацк, Верхнядзвінск з Латвіяй. А Сож яднае Магілёўшчыну (Крычаў, Чэрыкаў, Слаўгарад) з Гомельшчынай (Чачэрск, Ветка, Гомель) і ўпадае ў Дняпро каля Лоева, прабегшы па нашым краі амаль паўтысячы кіламетраў.

Тры вялікія ракі — Бярэзіна, Вілія, Нёман — пачынаюцца на беларускіх землях. Апеты ў

песнях, услаўлены Якубам Коласам Нёман, як і Вілія, напалову належыць беларускаму краю. Каля Каўнаса (былая назва Коўна) ен прымае воды Віліі. І толькі Бярэзіна цалкам належыць Беларусі. Рака бярэ выток каля Докшыцаў, і яе шлях (613 км) пралягае па тэрыторыі Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей, яна злучае раённыя цэнтры Барысаў, Беразіно, Бабруйск, Светлагорск. Бярэзіна можа прэтэндаваць на тое, каб стаць ракой-сімвалам Беларусі.

*Азёры — вочы зямлі*. Прамякістыя, уважлівыя — у час сумоўя прыродных сіл, іх духоўнага яднання. І ўсхваляваныя, бурлівыя — калі неспакой, трывога пагрозліва расплываюцца па абшарах.

Беларусь — зямля відушчая. Тысячы яе азёраў прагна ўглядаюцца ў неба, перадаючы яму зямную ласку, трапяткую даверлівасць і адначасова ўспрымаючы яго цяпло, духоўную энергію.

Беларускім Паазер'ем называюць паўночны рэгіён краіны. Тут азераў што зорак на небе. У Браслаўскім і Ушацкім раёнах яны займаюць дзесятую частку тэрыторыіі і як упрыгожваюць край, ствараюць маляўнічыя краявідыі Але ж яны і кормяць насельнікаў, круглы год сілкуюць свежай рыбай. У азерах водзяцца лешч, судак, акунь, плотка, лінь, карась і інш. (дарэчы, усяго на Беларусі каля 200 відаў прамысловых рыб).

Не менш азёраў і на Беларускім Палессі. Пераважная большасць з іх “старычныя вадаёмы”, г. зн. што яны ўтварыліся пасля змены рэчышча ракі ці рэчкі (пасля адхілення напрамку ракі ў старым рэчышчы застаюцца глыбокія мясціны, запоўненыя вадой, — «старыкі»). У поймах Дняпра, Прыпяці, Заходняй Дзвіны, Немана, Бярэзіны больш за 9 тысячаў такіх вадаёмаў (а ўсяго на Беларусі амаль 11 тысячаў азёр). Памерамі сваей акваторыі яны не вызначаюцца (75% з іх маюць плошчу да 0,1 км$^2$), але ствараюць утульнасць на абшарах, упрыгожваюць іх. Пра возера Нарач ведаюць далёка за межамі Беларусі. Яго хараство перададзена ў паданнях і песнях, услаўлена Максімам Танкам і іншымі паэтамі. Тут працуюць санаторыі і дамы адпачынку, дзіцячы лагер «Зубраня». Гэта самае вялікае возера Беларусі. Яго плошча амаль 80 км$^2$. Яму значна саступаюць памерамі азёры — Асвейскае (52,8), Чырвонае (43,6), Лукомльскае (36,7), Дрывяты (36,1)...

А самае глыбое возера — Доўгае, што ў Глыбоцкім раёне. Яго глыбіня — 53,7 м. Возера Свіцязь, якое непадалёку ад Навагрудка падарозе на Баранавічы, лічуць самым паэтычным. Вялікі славянскі паэт Адам Міцкевіч (народжакы ў беларускай шляхецкай сям'і, але пісаў на польскай мове) мроіў ім і адлюстраваў яго маляўкічасць і гісторыю ў вершах і баладах. І цяпер тут збіраюцца маладыя літаратары.

Рэкі і азёры ўзнікаюць у працэсе ўзаемадзеяння прыродных сіл. А многія вадаёмы на зямлі з'явіліся ад актыўнай людской дзейнасці. Яшчэ ў старажытнасці рабілі запруды, стаўкі для арашэння палёў і садоў, для вадаправодаў і вадзяных млынаў. У XX ст. чалавек, узброены ведамі, для сваёй выгоды прыпыніў бег рэк, узвёў плаціны на іх і прымусіў ваду, што назбіралася ў вялікім аб'ёме, служыць яму, аддаваць сваю энергію. Так стварыліся вадасховішчы — своеасаблівыя рукатворныя азёры.

Самае вялікае з іх на Беларусі — Вілейскае. Яго плошча — 75 км$^2$, амаль такая, як у Нарачы. Вада ад яго па канале паступае ў Свіслач для вода-забеспячэння Мінска. На гатай рацэ ўзнік шэраг вадасховішчаў. На пачатку 1940-х гадоў мінскія камсамольцы пашырылі яе рэчышча ў тым месцы, дзе яна ўбягала ў горад (цяпер гета каля яго цэнтра), і ўтвораны вадаём назвалі Камсамольскім возерам. Праз дваццаць гадоў вышэй па цячэнні з'явілася Заслаўскае вадасховішча, якое ў побыце атрымала назву Мінскае Мора, а пазней — вадаём Дразды. У Асіповіцкім раёне на Свіслачы пабудавалі гідраэлектрастанцыю, перад якой раскінулася Асіповіцкае вадасховішча. Невялікія плаціны ўзведзены і на іншых рэках і рэчках. Па ўсёй краіне зрабілі шэраг вадасховішчаў для развядаення рыбы...

Там, дзе вада, заўсёды пульсуе жыццё. І наша Беларусь, якую за мноства рэк і азёр назвалі сінявокай, напоўнена разнастайнай жыццядайнасцю, стваральнай духоўнасцю.

***Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН***

**Источник:** Пралеска.-2009.-№4.-С.62-63.